ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт

№ 8 (964) | АЎТОРАК, 11 мая 1999 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## Майскія святы. А колькі з іх радасці?

Людзям старэйшага і сярэдняга пакаленняў заўжды прыходзяць на памяць тыя дні, калі адзначаліся Першамайскае свята і Дзень Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэтыя падзеі без перабольшвання радавалі, неяк па-асабліваму хвалявалі, пяшчотна закраналі нашы душы і сэрцы.

Ад былой узнёсласці мы апусціліся да будзённай празаічнасці. Гэта звязана з многімі акалічнасцямі, гаварыць аб якіх няма патрэбы.

І ўсё ж святкаванне самых значных майскіх дат прайшло не зусім будзённа. Былі, як і паўсюдна, дэманстрацыі, маніфестацыі, палымяныя выступленні, шчырыя віншаванні і цёплыя пажаданні. А ўсё гэта садзейнічае нашаму з'яднанню і імкненню да лепшай будучыні.

Па лепшых традыцыях прайшлі святочныя дні ў нашым універсітэце. У агульнагарадской калоне прайшлі ў Першамайскім шэсці і ўдзельнічалі ў дэманстрацыі працоўных горада прадстаўнікі рэктарата, факультэтаў і іншых структурных падраздзяленняў універсітэта.

Вялікаму Дню Перамогі, усім змагарам за вызваленне нашай Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў мы выказалі сваё прызнанне і павагу. У прыватнасці, у студэнцкім парку адбыўся мітынг, на якім аддадзена даніна светлай памяці тым, хто загінуў у імя лепшай будучыні новых пакаленняў. І хаця пакуль што не ўсё здзяйсняецца, але мы нізка схіляем галовы перад памяццю тых, чые імёны не згаснуць у памяці народа.

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

Па колькасці вынесеных на абмеркаванне пытанняў красавіцкае пасяджэнне Савета універсітэта было даволі насычаным. На яго пачатку ўвага была сканцэнтравана на тым, як вядзецца падрыхтоўка да ўступных экзаменаў ва універсітэце ў бягучым годзе. З інфармацыяй выступіў намеснік старшыні прыёмнай камісіі прафесар С.Ф.Каморнікаў. Ён жа, як дэкан факультэта псіхалогіі і падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ, зрабіў паведамленне аб удзеле выкладчыкаў ГДУ ў рабоце базавых сярэдніх школ № 56 і № 8.

Па прадстаўленню прарэктара па навуковай рабоце, старшыні конкурснай камісіі, прафесара Д.Р.Ліна зацверджаны лаўрэаты Скарынаўскіх чытанняў. Як мы паведамлялі ў папярэднім нумары газеты, імі сталі кандыдат біялагічных навук, дацэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін М.М.Дайнэка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры педагогікі Ф.У.Кадол, кандыдат юрыдычных навук, загадчык кафедры крымінальнага права і працэсу, дэкан юрыдычнага факультэта Ю.А.Ключнікаў, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі В.Р.Сафонаў, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры філасофіі А.А.Фяськоў.

Савет рэкамендаваў БелВАКу прысудзіць вучонае званне прафесара доктару фізіка-матэматычных навук, загадчыку кафедры агульнай фізікі І.В.Семчанку.

Аб арганізацыі харчавання студэнтаў у сталовай і буфетах вучэбных карпусоў Савету далажыла дырэктар прадпрыемства грамадскага харчавання Т.М.Соцціева.

Аб выкананні плана мерапрыемстваў па ўхіленні недахопаў, якія былі выяўлены ў ходзе атэстацыі нашага універсітэта, праінфармаваў Савет вучоны сакратар В.Ю.Залатарэнка. Ён жа паведаміў аб унясенні некаторых змяненняў у Статут ГДУ.

З шэрагам інфармацыйных паведамленняў, якія датычацца дзейнасці навукова-даследчага сектара, выступіў яго начальнік В.Р.Сафонаў.

На пасяджэнні Савета былі разгледжаны таксама некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## ВЫКАЗАНА ЎДЗЯЧНАСЦЬ МІНІСТЭРСТВА

Гэтае прыемнае паведамленне даслана на адрас рэктара нашага універсітэта Л.А.Шамяткова:

"Міністэрства адукацыі выказвае Вам і супрацоўнікам універсітэта ўдзячнасць за арганізацыйнае і метадычнае забеспячэнне рэспубліканскага семінара прарэктараў па выхаваўчай рабоце і начальнікаў аддзелаў выхаваўчай работы з моладдзю "Удасканаленне форм і метадаў інфармацыйнай і выхаваўчай работы са студэнтамі", які прайшоў 5-7 красавіка г.г. на базе Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

Просім заахвоціць усіх супрацоўнікаў універсітэта, якія прымалі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні семінара".

**Намеснік міністра А.Г.СЛУКА.**



*Карона каралевы Веры Чарняўскай вельмі да твару. Яе першакурсніца філфака ГДУ заваявала на міжнародным студэнцкім конкурсе грацыі і майстэрства, фінальны тур якога адбыўся ня даўна ў г.Мінску. Шчаслівы міг удачы для дзяўчыны стане памятным на ўсё жыццё.*

*Фота* У.ЧЫСЦІКА.

## АДРАДЖАЕЦЦА ТАВАРЫСТВА "ВЕДЫ"

У нашай краіне прыняты меры па адраджэнню дзейнасці таварыства "Веды". З гэтай нагоды ва універсітэце адбыўся сход, на якім выраšалася арганізацыйнае пытанне. Яно асвятлялася ў выступленнях прарэктара па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.М.Воінава і адказнага сакратара абласной арганізацыі таварыства "Веды" Э.А.Сусолкіна.

Старшынёй універсітэцкай арганізацыі таварыства "Веды" абраны кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі І.Ф.Эсмантовіч.

Выбраны дэлегаты на абласную канферэнцыю таварыства.

## АБРАНЫ ЗАМЕЖНЫМ ЧЛЕНАМ АКАДЭМІІ

Загадчык кафедры педагогікі нашага універсітэта прафесар Іван Фёдаравіч Харламаў шырока вядомы сваімі навукова-метадычнымі працамі як у нашай краіне, так і за яе межамі. Яго кнігі выдадзены ў Кітаі, Чэхаславакіі, Польшчы і іншых краінах. Па напісанаму ім падручніку педагогіку вывучаюць студэнты універсітэтаў і педагагічных інстытутаў нашай рэспублікі, Расійскай Федэрацыі, Малдовы і іншых краін СНД. Гэты падручнік амаль кожны год перавыдаецца. У 1998 годзе ён надрукаваны ў Мінску ў выдавецтве "Университетское", а нядаўна зноў выйшаў у Маскве з грыфам Міністэрства агульнай і прафесійнай адукацыі Расійскай Федэрацыі.

Не парывае вучоны сувязь і з навуковымі ўстановамі Расіі, а таксама і Расійскай акадэміяй адукацыі. З 1974 года ён быў членам-карэспандэнтам, а з 1990 года — правадзейным членам Акадэміі педагагічных навук СССР, а калі Саюз распаўся, перастала існаваць і саюзная акадэмія. Аднак Акадэмія адукацыі Расіі ў неафіцыйным парадку падтрымлівала творчыя сувязі з акадэмікамі былой акадэміі педнавук СССР. А нядаўна многія з іх былі абраны замежнымі членамі Расійскай Акадэміі адукацыі, у тым ліку і прафесар І.Ф.Харламаў. Днямі з гэтай акадэміі ён атрымаў наступную тэлеграму: "Глыбока паважаны Іван Фёдаравіч! Віншуем Вас з выбраннем замежным членам Расійскай Акадэміі адукацыі. Высока ацэньваючы Вашы заслугі ў навуцы і адукацыйнай дзейнасці, Прэзідыум Акадэміі спадзяецца на далейшае плённае супрацоўніцтва. Прэзідэнт Н.Д.Нікандраў".

### ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат гістарычнага факультэта, кафедра гісторыі Беларусі горача віншуюць асістэнта названай кафедры ЯШЧАНКА Аксану Рыгораўну з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.*

## У ПРАФСАЮЗА КЛОПАТАЎ НЯМАЛА

На факультэтах і ў структурных падраздзяленнях універсітэта прайшлі справаздачна-выбарныя прафсаюзныя сходы.

Па статуту прафсаюза работнікаў адукацыі асноўныя яго функцыі заключаюцца ў тым, каб садзейнічаць паляпшэнню ўмоў працы, быту і адпачынку працоўных, абараняць іх правы і інтарэсы, прыцягваць іх да кіравання вытворчымі і грамадскімі справамі, умацоўваць працоўную дысцыпліну. Як выконваюцца на справе гэтыя палажэнні, ішла зацікаўленая размова на прафсаюзных сходах у ГДУ. Давалася ацэнка рабоце прафсаюзных бюро, адзначаліся як станоўчае ў іх дзейнасці, так і недахопы, над якімі яшчэ трэба працаваць у далейшым.

Членамі прафсаюза выказана нямала канкрэтных прапаноў па ўдасканаленню вучэбнага працэсу з больш шырокім укараненнем у яго сучасных вылічальнай і камп'ютэрнай тэхнікі, умацаванню працоўнай дысцыпліны, ахове працы і тэхнікі бяспекі, па арганізацыі лячэння і аздараўлення членаў універсітэцкага калектыву і інш.

На сходах адзначалася, што няпростая эканамічная сітуацыя ў краіне ўскладняе работу і прафсаюзных арганізацый. Членам прафбюро часта даводзіцца працаваць за кошт асабістага энтузіязму.

У выступленнях на сходах узнімалася тыя пытанні, без вырашэння якіх немагчыма далейшая плённая работа ў падраздзяленнях.

На сходах выбраны новыя саставы прафбюро і дэлегаты на справаздачна-выбарную канферэнцыю універсітэта, якая адбудзецца восенню.

## ЛЕПШЫЯ ЗНАЎЦЫ АНГЛІЙСКАЙ МОВЫ

Ва універсітэце праведзена алімпіяда па англійскай мове сярод студэнтаў нямоўных факультэтаў. У ёй прынялі ўдзел 20 студэнтаў.

Першае месца занялі першакурснікі эканамічнага факультэта спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве" Аксана Келасьева і Сяргей Каморнікаў, другое — студэнтка фізічнага факультэта Святлана Вярбіцкая (гр.Ф-11) і Андрэй Дубінін з геолага-геаграфічнага факультэта (гр.РВ-11). Трэцяе месца падзялілі паміж сабой студэнтка эканамічнага факультэта Ала Дзюжава (гр.ФК-21), першакурсніца фізічнага факультэта Крысціна Мельнікава (гр.Ф-13) і Аляксандр Шульга з гэтага ж факультэта (гр.Ф-21).

*К 200-летию со дня рождения гения русской литературы*

# А.С.ПУШКИН И ГОМЕЛЬЩИНА

Как отмечает литературовед С.Букчин, А.С.Пушкин был хорошо знаком с белорусским краем. Об этом свидетельствуют десятки фактов, событий, географических названий, вошедших в его произведения. Так, в подготовительных текстах к "Истории Петра" упоминается "Гомля" (Гомель), а в "Истории Пугачева" говорится, что будущий предводитель крестьянской войны 1773-1775 гг. Е.Пугачев одно время скрывался "в раскольничьей слободке в Ветке".

Внимательный читатель пушкинских текстов может обнаружить и другие белорусские реалии.

Персонажами многих литературных произведений писателя стали известные русские полководцы, военные и государственные деятели. Так, в ряде произведений А.С.Пушкина упоминается русский полководец XVIII в., выдающийся представитель военного искусства П.А.Румянцев, которому в 1775 г. императрица Екатерина II пожаловала Гомель. "Орлов, Румянцев и Суворов, потомки грозных славян, Перуном Зевсовым победу похищали" ( "Воспоминание в Царском селе"). В "Капитанской дочке" упоминается "памятник в честь недавних побед графа П.А.Румянцева". А.С.Пушкин был хорошо осведомлен о деятельности "румянцевского научного кружка", которым руководил бывший русский канцлер Николай Петрович Румянцев. Из публикаций "ученой дружины" Н.П.Румянцева Пушкин черпал материал для многих своих литературных произведений исторической тематики. Так, создавая "Бориса Годунова", Александр Сергеевич внимательно изучил акты "смутного времени", опубликованные в "Собрании государственных грамот и договоров". Использованы были им и мотивы Собрания Кирши Данилова. Особый интерес вызывали у Пушкина "Памятники российской словесности XII в.", изданные также по инициативе сотрудников румянцевского научного кружка. В этой книге были собраны произведения К.Туровского, Даниила Заточника, митрополита Никифора, Кирика Новгородца.

А.С.Пушкин подготовил специальную рецензию на Собрание сочинений Георгия Конисского, архиепископа белорусского, изданного одним из бывших научных сподвижников Н.П.Румянцева, протоиереем Иоанном Григоровичем в 1835 г. Рецензия Пушкина была напечатана в 1836 г. в первом номере журнала "Современник". Священнослужитель Георгий Конисский, по мнению А.С.Пушкина, "один из самых достопамятных мужей минувшего столетия, чья жизнь принадлежит истории". В этой же рецензии он тепло отозвался о белорусах, сказав, что они — "народ, издревле нам родной".

Следует отметить, что А.С. Пушкин был активным членом "Общества любителей российской словесности", а также литературного кружка "Арзамас". За "круглым столом" "Арзамаса" Пушкин встречался с Жуковским, Батюшковым, Вяземским, Давыдовым, а также с братом Н.П.Румянцева, поэтом Сергеем Петровичем Румянцевым, который после смерти Николая Петровича владел Гомелем.

Как известно из книги белорусского писателя, уроженца Гомельщины Д.Симоновича "Подорожная Александра Пушкина", русский поэт в мае 1820 г. и в августе 1824 г. проезжал по белорусской земле. Его путь проходил и через населенные пункты Гомельщины Белицу и Чечерск. Чечерск в конце XVIII — начале XIX ст., как свидетельствуют исторические источники, становится одним из важнейших культурных центров Беларуси. С 1774 г. владельцем Чечерска стал первый белорусский наместник и генерал-губернатор Могилевской губернии, фаворит Екатерины II Захар Григорьевич Чернышев. После его смерти наследовала имение его жена Анна Родионовна, а затем его брат Иван Григорьевич, поскольку детей у Захара Григорьевича не было. В начале XIX ст. владельцем Чечерска становится полковник Иван Гаврилович Кругликов-Чернышев и его жена Софья Григорьевна Чернышева, которая доводилась внучатой племянницей ставленнику Екатерины II.

В конце 80-х гг. XX ст. ученые-литературоведы И.Ободовская и М.Дементьев на основании архивных документов установили, что Пушкин и Чернышевы имели общих предков из старинного рода князей Ржевских. Так, Сарра Юрьевна Ржевская, в замужестве Пушкина, дочь любимца Петра I Юрия Алексеевича Ржевского, приходилась Пушкину прабабкой. А внучка другой дочери, Анны Юрьевны, Елизавета Петровна Квашнина-Самарина вышла замуж за Григория Ивановича Чернышева, племянника фаворита Екатерины II. Таким образом, дети графа Г.И.Чернышева доводились четвероюродными братьями и сестрами А.С.Пушкину.

Можно предположить, что Пушкин сделал остановку в Чечерске, чтобы навестить своих родственников Чернышевых по дороге в южную ссылку или когда возвращался в Михайловское.

Особые чувства питал А.С.



Пушкин к своей сестре Муравьевой Александре Григорьевне, урожденной графине Чернышевой, жене декабриста Муравьева. Именно с ней, которая поехала вслед за своим мужем в ссылку в Сибирь в начале января 1827 г., А.С. Пушкин передал своим друзьям-декабристам стихотворение "Во глубине сибирских руд". А.Г.Муравьева привезла в Сибирь также стихотворение поэта, посвященное лицейскому другу Пушкина И.И.Пущину "Мой верный друг, мой друг бесценный". Кстати, Ивана Пущина, как и его брата Михаила Пущина, мы можем по праву считать своими земляками. В Паричах (нынешний Светлогорский район) находилось отцовское имение Пущиных. Их отец, сенатор Иван Петрович, никогда не бывал здесь, доверив все дело по имению управляющему Бялковскому. Совсем по-другому относился к Паричам его сын Михаил. Еще в юности он мечтал поселиться в Паричах, жениться, растить детей... Но судьба распорядилась иначе. За участие в восстании 1825 г. капитан лейб-гвардии конно-пионерского эскадрона Михаил Пущин был лишен чинов и дворянства и отдан в солдаты. Служил некоторое время в Красноярском гарнизоне в Сибири, затем переводится на Кавказ, где за смелость и воинский талант получил офицерский чин. Был тяжело ранен. В 1836 г. подал в отставку и поселился в Паричах. В 1857 г. Александр II возвращает ему прежний чин капитана гвардии. В это же время Л.Н.Толстой предлагает ему написать воспоминания о Пушкине и встречах с ним на Кавказе в 1829 г. В "Путешествии в Арзрум" Пушкин посвятил ему несколько строк: "Здесь увидал я ... Михаила Пущина, раненного в прошлом году. Он любим и уважаем, как славный товарищ и храбрый солдат".

Иван Пущин в это время отбывал наказание в Читинском Остроге. 25 августа 1829 г. Михаил Пущин написал письмо брату из Кисловодска: "... Время здесь проводим довольно приятно — лицейский твой товарищ Пушкин, который с пикою в руках следил турок перед Арзерумом, по взятии оного возвратился оттуда и приехал ко мне на воды... Разумеется, часто о тебе вспоминаем — он любит тебя по-старому и надеется, что и ты сохранишь к нему прежнее чувство".

С Гомельщиной и Пушкиным связано также имя декабриста Н.М.Муравьева, мужа А.Г.Чернышевой-Муравьевой. Никита Михайлович Муравьев — участник Отечественной войны 1812 года, поручик гвардии Генерального штаба, позднее капитан, член Союза спасения, Союза благоденствия и Северного общества. Осужден к 20-ти годам каторги. Общение Пушкина с Муравьевым относится к лицейскому и петербургскому периоду жизни поэта. Они встречались в лицее, на заседаниях литературного общества "Арзамас". Следует отметить, что Н.М.Муравьев в 1820-1821 гг. проходил военную службу в Беларуси, в т.ч. и на Гомельщине. Исследователь декабристского движения в Беларуси С.В.Букчин в книге "К мечам рванулись наши руки" на основании архивных документов раскрывает интересные эпизоды его военной службы в Беларуси, в т.ч. и Рогачеве. В связи с предстоящим приездом в Минск императора Александра Н.М.Муравьеву было поручено главным командованием составить топографический маршрут его следования, который должен был проходить от Бобруйска через станцию Поболово прямо до г.Рогачева, от станции Поболово до м.Жлобин и от Жлобина через г.Рогачев до г.Старого Быхова. Муравьев в письмах к матери делится своими впечатлениями о посещении Рогачева: "Рогачев есть очень изрядный городок на Днепре — в десяти верстах от Могилева. Местоположение его прекрасно. Он стоит на крутой горе и висит над Днепром...". Затем он упоминает плотину, которая оберегает город от наводнения.

Можно предположить, что А.С.Пушкин был знаком и с Рогачевом. Об этом свидетельствует краткая запись на письме к его лицейскому другу Антону Дельвигу, относящаяся к началу 1827 г., где рукою Пушкина написано: "в Мог. Губ. Рогачев, Пет. Ив. Сюбека, д.Городн". Кто он, этот Петр Иванович Сюбека? К сожалению, до сих пор эта личность учеными-пушкинистами не установлена.

В мае 1829 г. Пушкин, не испросив у властей разрешения, уехал на Кавказ с намерением посетить действующую армию. Кавказ привлекал Пушкина не только романтическими воспоминаниями, но и встречей с друзьями юности и ссыльными декабристами. В Арзруме Пушкин оказался среди друзей и знакомых. В действующей армии, которой командовал И.Ф.Паскевич, находились декабристы, которым Николай I разрешил отправиться рядовыми на "погибельный Кавказ". Среди них были: З.Г.Чернышев, брат А.Г.Муравьевой, брат Ивана Пущина — Михаил и другие. Пребывание в армии обогатило Пушкина новыми впечатлениями, в результате которых появилось произведение "Путешествие в Арзрум". Одним из действующих его персонажей стал командир Отдельного кавказского корпуса, генерал-фельдмаршал, граф Эриванский, светлейший князь Варшавский, наместник Царства Польского Иван Федорович Паскевич. Первая встреча Пушкина с Паскевичем состоялась 14 июня 1829 г., в дальнейшем Паскевич не хотел отпускать Пушкина от себя, "не только во время сражения, но и на привале, в лагере и вообще всегда"... Недовольный встречами поэта со ссыльными декабристами, Паскевич учредил над ними надзор.

Официозная печать и, по-видимому, сам Паскевич ожидали от Пушкина прославления успехов кампании: однако поэт в своем творчестве почти обошел эту тему. Лишь в 1831 г. в стихотворении "Бородинская годовщина" Пушкин посвятил фельдмаршалу две лестные строфы.

Следует отметить, что с Гомельщиной тесно связаны и имена потомков А.С.Пушкина. Так, в 1929 г. после окончания краткосрочных педагогических курсов при Рогачевском педтехникуме в Октябрьский район была направлена праправнучка Пушкина Ольга Клименко. Она работала учительницей в деревне Ратмировичи, затем в Новой Дуброве и Оземле. Одну зиму в Ратмировичах жил ее младший брат Сергей, которого она взяла к себе после трагической гибели репрессированных родителей.

В конце своего сообщения о связях А.С.Пушкина с Гомельщиной хотелось бы выразить надежду, что в период подготовки к празднованию пушкинского юбилея будут установлены новые, до сих пор еще не известные факты.

**К.БИРЮКОВИЧ,**
**кандидат исторических наук.**

# ТРАДЫЦЫІ ФІЛФАКА — У БУДУЧЫНЮ!

З надыходам вясны значна актывізавалася грамадска-культурнае жыццё ў нашым універсітэце. Ва ўсіх карпусах стэнды аб'яў літаральна "трашчаць" ад усемагчымых афіш і запрашэнняў. І калі заняцца нескладаным матэматычным падлікам і разам з тым актыўна наведваць усе мерапрыемствы ў актавай зале, атрымліваецца, што амаль палова сярэдняй студэнцкай стыпендыі патрэбна на білеты. Вось і выбірай, студэнт, што найбольш цікава.

Я ж хачу расказаць аб незвычайным тыдні з жыцця студэнтаў-філолагаў. Гэта — тыдзень філалагічнага факультэта і, як яго састаўная частка, Дзень філолага. Тыдзень сапраўды быў вельмі насычаны, вясёлы і цікавы. Адкрывала яго студэнцкая навуковая канферэнцыя. З уступным словам да ўсіх прысутных звярнуўся дэкан факультэта У.А.Бобрык.

Дзень у дзень на працягу тыдня, нават у час заняткаў, не пуставалі хол і калідор філфака. Студэнцкім аргкамітэтам былі арганізаваны тут выставы. Студэнты і госці факультэта маглі азнаёміцца са шматлікімі творамі багатай спадчыны вялікага рускага пісьменніка А.С.Пушкіна, 200-годдзе з дня нараджэння якога святкуе ў гэтым годзе ўвесь свет. Хочацца выказаць словы падзякі супрацоўнікам бібліятэкі за падрыхтаваныя матэрыялы і студэнтам за дапамогу ў афармленні і ахове выстаў.

У жанры студэнцкага гумару і добрых жартаў прайшла выстава насценгазет. Асабліва зацікаўленымі ў ёй былі студэнты І курса і, як вынік, салодкі прэзент дастаўся групе БА-13, студэнтка якой В.Вержахоўская і прадставіла каляровую жартоўную насценгазету. Арыгінальную "АБэЦэДу" падрыхтавалі чацвёртакурснікі. Трапныя выказванні выкладчыкаў былі падмечаны тут са своеасаблівым гумарам.

Самым жаданым і доўгачаканым было ток-шоу выкладчыкаў са студэнтамі "Адкажы на пытанне". У апошні час змянілася кіраўніцтва на факультэце, таму пытанняў было шмат. Студэнтаў хвалявалі як арганізацыйныя пытанні, так і больш асабістага характару, некаторыя з іх былі з вялікай доляй гумару. Сапраўднымі кіраўнікамі паказалі тут сябе дэкан У.А.Бобрык і яго новы намеснік па выхаваўчай рабоце Д.Л.Мамачкін.

Закрываў святочны тыдзень урачысты канцэрт, падрыхтаваны студэнтамі факультэта. Намеснік дэкана па вучэбнай рабоце Л.П.Кузьміч усялякім чынам дапамагаў аргкамітэту факультэта. Шмат часу і сіл прыклалі Н.Валошына (IV курс), Д.Хоміч (V курс), Т.Ушакова (III курс), аўтар гэтых радкоў і іншыя студэнты. Таму людзей у зале было даволі шмат. Танцы прыгажунь-дзяўчат межаваліся з песнямі і жартамі. Вельмі спадабаліся студэнткі-выканаўцы "ужывую" кампазіцый "Ало, ало..." В.Сухамера (II курс) і "На Ціхарэцкую..." Т.Калашнікава (IV курс). Разам са студэнтамі нашага факультэта весяліў гледачоў універсітэцкі тэатр эстрадных мініяцюр "СанТэхЭлектраМантаж". Доўгія апладысменты панавалі ў зале пасля заканчэння канцэрта.

І хочацца пажадаць, каб такія святы сталі традыцыяй на дзесяцігоддзі. Бо гэта таксама немалаважны паказчык вучэбна-выхаваўчага працэсу.

**Сяргей АРЦЁМАЎ, студэнт гр.БА-13,**
**член аргкамітэта філалагічнага факультэта.**

# АБ УНІВЕРСІТЭЦЕ ВАРШАЎСКІМ

У нас ёсць адна выдатная традыцыя: пасля вяртання з замежжа апісаць свае ўражанні з тамтэйшага пабыцця, аздобіць успаміны фотаздымкамі, прывезенымі адтуль, захапіцца якой-небудзь праявай чужога жыцця і ўсё гэта даверыць цярплівай газетнай паперы. Тыраж нашай газеты – 1000 экземпляраў. Яе чытаюць, напэўна, звыш 1000 чалавек, і ў кожнага, думаецца, знайшлося б нейкае сваё асабістае пытанне. Таму, не ламаючы доўга галаву, чытаем:

**“Гісторыя Варшаўскага універсітэта непарыўна звязана з гісторыяй Польшчы і яе сталіцы. Заснаваны ў 1816 г., універсітэт працягнуў традыцыі трох старых інстытутаў – Рыцарскай школы, адкрытай у 1766 г. у Казіміраўскім палацы (зараз гэты будынак займае адміністрацыя універсітэта), школы Права і школы Медыцыны, заснаваных адпаведна ў 1808 і 1809 гг. Пасля падзелаў Польшчы паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй у канцы 1700-х гг., Варшава была ізалявана ад традыцыйнага адукацыйнага цэнтра ў Кракаве. Толькі 19 лістапада 1816 г. Аляксандр I, імператар Расіі і кароль Польшчы, даў згоду на адкрыццё універсітэта.**

Універсітэт да гэтага часу носіць стары герб: з раскінутымі крыламі каранаваны арол трымае пальмавую галінку ў левых кіпцюрах, лаўравую – у правых (гэта сімвалы працалюбства і славы); арол акружаны пяццю зоркамі, якія сімвалізуюць 5 даўнейшых факультэтаў універсітэта – багаслоўскі, права, медыцыны, філасофіі і свабодных мастацтваў.

Пасля таго, як большасць студэнтаў прыняла ўдзел у Лістападаўскім паўстанні ў 1830 г., універсітэт быў зачынены расійскімі ўладамі да наступнага года. З 1857 г. адкрылася Галоўная школа (зараз гэта адзін з універсітэцкіх карпусоў. – **Р.С**.), у якой выкладаліся хірургія, права, кіраванне, дзейнічалі філолага-гістарычны і фізіка-матэматычны факультэты. На некалькі гадоў універсітэт зноў быў зачынены пасля Студзеньскага паўстання 1863 г., калі ў ім вучылася ўжо 3000 студэнтаў, многія з якіх сталі прадстаўнікамі грамадскай і інтэлектуальнай эліты нацыі. У 1870 г. у Варшаве быў адчынены Расійскі імператарскі універсітэт, прызначаны для русіфікацыі польскага грамадства. Большасць выкладчыкаў была з Расіі. Нягледзячы на гэта, універсітэт значна вырас: будаваліся новыя карпусы і пашыраўся бібліятэчны фонд. Сярод студэнцтва (1500-2000 чалавек) палякі складалі 60-70%. У 1905 г. распачаўся байкот рускамоўных дысцыплін у падтрымку лекцый на польскай мове. Колькасць польскіх студэнтаў знізілася да 10% (большасць перайшла ў іншыя універсітэты).



ГАЛОЎНЫ ЎВАХОД У ВАРШАЎСКІ УНІВЕРСІТЭТ

У часы першай святовай вайны нямецкія акупацыйныя ўлады далі згоду на павелічэнне польскамоўных факультэтаў, якія сталі хутка ўзбуйняцца. За 1915-1918 гг. колькасць студэнтаў павялічылася з 1000 да 4500 чалавек. Атрыманне незалежнасці ў 1918 г. дало магчымасць універсітэту ўпершыню за ўсю гісторыю існавання распрацоўваць свае вучэбныя праграмы і весці навучанне ва ўмовах поўнай свабоды. Універсітэт хутка дасягнуў еўрапейскага ўзроўню дзякуючы ў значнай ступені многім вядомым прафесарам, якія прыехалі ў Варшаву з Расіі, Галіцыі і Заходняй Еўропы. Да пачатку 1930-х гадоў Варшаўскі універсітэт стаў самым вялікім у Польшчы з колькасцю выкладчыкаў і студэнтаў адпаведна 250 і 10000 чалавек.

Калі нацысты зачынілі польскія універсітэты ў часы другой святовай вайны, Варшаўскі універсітэт быў пераабсталяваны пад паліцэйскія казармы, а яго бібліятэка стала нямецкай уласнасцю. Пад рызыкай смяротнага пакарання многія выкладчыкі праводзілі заняткі на прыватных кватэрах. Эфектыўная сістэма тайнага навучання паступова стала часткай Польскага вызваленчага руху. У 1944 годзе каля 300 выкладчыкаў і 3500 студэнтаў самаададдана служылі гэтай справе. Некалькі соцень магістраў і 9 дактароў (па-нашаму – кандыдатаў навук. – **Р.С.**) атрымалі вучоныя ступені ў падполлі. У часы акупацыі ў цэлым загінула 162 выкладчыкі і 30 адміністрацыйных работнікаў, было разбурана 60% універсітэцкіх будынкаў, раскрадзена 70-80% бібліятэчнага фонду.

У снежні 1945 г. універсітэт зноў адчыніўся з колькасцю студэнтаў больш за 4000 чалавек.

У другой палове 1950-х гг. адрадзілася сапраўднае універсітэцкае жыццё, выкладанне большасці універсітэцкіх дысцыплін дасягнула еўрапейскага ўзроўню, усталёўваліся міжнародныя сувязі. Узрастаючая незадаволенасць палітычнай сітуацыяй у Польшчы прывяла ў 1968 годзе да студэнцкіх дэманстрацый, пасля падаўлення якіх многія студэнты і прафесары вымушаны былі пакінуць універсітэт, а некаторыя эміграваць з краіны. Тым не менш, універсітэт з колькасцю студэнтаў 20000 чалавек застаўся цэнтрам вольнадумства, выхаваўшы многіх выдатных дзеячаў.

Карацей кажучы, універсітэт адыграў важную ролю ў стварэнні генерацыі палякаў, якая павяла за сабой краіну праз палітычныя і эканамічныя рэформы ў канцы XX ст.

У 1968 годзе быў заснаваны філіял Варшаўскага універсітэта ў Беластоку. На працягу першых 4-х гадоў свайго існавання ён рэалізоўваў толькі трохгадовую праграму прафесійнага навучання для падрыхтоўкі выкладчыкаў і дзяржаўных служачых. За наступныя тры дзесяцігоддзі філіял у Беластоку значна вырас: у 1997 г. у яго ўваходзілі шэсць факультэтаў, на якіх вучылася больш за 12000 студэнтаў. У 1997-1998 навучальным годзе гэты філіял стаў функцыянаваць як незалежны універсітэт.

Сёння Варшаўскі універсітэт з'яўляецца самым вялікім у Польшчы. У ім працуюць звыш 2600 выкладчыкаў і набываюць адукацыю больш за 48000 студэнтаў (па дадзеных 1998 г.). Ва універсітэце набываюць веды па 32-х галінах навукі і мастацтва на 18-ці факультэтах, дзе выкладаюцца дакладныя, грамадазнаўчыя, гуманітарныя дысцыпліны, арганізаваны і распрацаваны 30 дадатковых унутрыфакультэцкіх цэнтраў і праграм.

Універсітэт узначальвае рэктар, які са сваімі 4-ма намеснікамі выбіраецца на трохгадовы тэрмін калегіяй выбаршчыкаў. Савет універсітэта, які складаецца з дэканаў факультэтаў і прафесуры, супрацоўнікаў і студэнтаў, з'яўляецца кіруючым органам.

Ва універсітэце прысуджаюцца ступені бакалаўра мастацтваў, бакалаўра навук, бакалаўра камерцыі і кіравання, доктара філасофіі і адбываецца габілітацыя (тое, што ў нас доктар навук. – **Р.С.**).

У 1997 г. 18 факультэтаў і аддзяленняў атрымалі вышэйшую катэгорыю (А), 7 аддзяленняў – катэгорыю В і 4 – С (усяго чатыры катэгорыі: А,В,С,Д). Напрыклад, факультэт гісторыі прадставіў 210 праектаў, факультэт фізікі – 157, факультэт сучасных моў і ўсходазнаўства – 131. За апошнія тры гады было прысуджана 315 доктарскіх ступеней (кандыдатаў навук. – **Р.С.**) і 140 габілітацыйных. За гэты ж час члены факультэтаў апублікавалі 13533 навуковыя працы, улючаючы 2702 кнігі і 10831 артыкул. Універсітэт правёў 474 канферэнцыі, у 296-ці з якіх прымалі ўдзел іншаземцы.

**Бібліятэка**

Універсітэцкая бібліятэка была заснавана ў 1817 г., атрымаўшы калекцыі кніг Варшаўскага лекторыя, прыватных бібліятэк каралёў Станіслава Панятоўскага і Станіслава Косткі Патоцкага, а таксама бібліятэк забароненых манастыроў. Гэта адна з трох найбольш багатых калекцый вучэбнай літаратуры ў Польшчы. Яна з'яўляецца не толькі галоўнай універсітэцкай бібліятэкай, але і цэнтральнай публічнай бібліятэкай грамадскіх навук. У ёй захоўваюцца айчынныя і замежныя працы па кожнай з дысцыплін мастацтва і навукі, якія выкладаюцца ва універсітэце; калекцыі ў галіне гуманітарных і грамадскіх навук. Бібліятэчны фонд складаецца прыкладна з 2500000 крыніц, уключаючы больш за 1500000 кніг, 600000 часопісаў, рукапісы, графіку, партытуры, мапы і мікраплёнкі. Бібліятэка рэгулярна абслугоўвае больш 20000 чытачоў”, – Warsaw University.

**Р.СЕРЫКАЎ,**
**асістэнт кафедры беларускай мовы.**



**З 1993 года ў нашым універсітэце працуе музей-лабараторыя Ф.Скарыны. З кожным годам тут папаўняецца фонд экспанатаў. Яны выклікаюць вялікую цікавасць у шматлікіх наведвальнікаў. За прайшоўшы час іх было звыш 5 тысяч. Гэта – людзі розных пасад і ўзростаў не толькі з нашага горада, вобласці, краіны, але і з-за іх межаў. У Кнізе ганаровых гасцей пакінулі свае подпісы і замежныя госці.**

**На гэтым здымку вы бачыце студэнтаў з горада-пабраціма Клермон-Ферана, якія паралельна набываюць адукацыю ў Франка-Беларускім інстытуце кіравання і нядаўна знаходзіліся ў нашым універсітэце.**

**Фота У.Чысціка.**

*Экскурс у мінулае*

# ШТО ДУМАЛІ ПРА НАШУ МОВУ

У канцы XVIII – пачатку XIX ст. не было дакладна вызначана месца беларускай мовы сярод іншых славянскіх моў. Яе адносілі хто да польскай, хто да рускай моў. Сярод тых, хто ў ліку першых вылучыў беларускую мову як самастойную, быў вядомы рускі філолаг, акадэмік Д.І.Языкаў (1773-1845 гг.), знакаміты навуковец і перакладчык. У гэтым кантэксце вельмі цікавай уяўляецца яго праца “Беларуская ці руская мова”. Вось што ён, у прыватнасці, напісаў у ёй:

“Настоящий язык Белорусский есть весьма любопытный памятник, который наши ученые должны бы тщательно изучать, потому, что он многое объясняет и в филологии нашего языка. Его можно назвать отцом Великороссийского наречия... Он сохранил во многих отношениях свой старинный вид и характер, и менее претерпел от форм Польского языка, нежели думают. Он был официальным языком Литовского Двора и правительства, еще во времена их язычества. Литовский статут, памятник чрезвычайно важный для истории нашего законодательства и для древней Русской филологии, писан на том языке, который еще в исходе семнадцатого столетия употреблялся в документах, признаваемых в Виленском магистрате...”

Встреча с поэтом

## "... ВСЯ ИЗ СОМНЕНИЙ И ВЕРЫ"

Недавно студентам I курса филологического факультета устроили маленький приятный сюрприз — встречу с гомельским поэтом Феликсом Мыслицким.

Стихи Феликса Эдуардовича — грустные и мелодичные, а поэзия его, по словам Р.Бородулина, "вся из сомнений и веры". А сам поэт говорит, что все его стихи "... чернобыльские, даже когда в них нет ничего о Чернобыле". Действительно, строки о Чернобыле — строгие, жуткие и печальные:

*Напомнят Чернобыль,*
*Гоморра, Содом*
*Еще раз народам о Боге,*
*Взорвется стоящий*
*на бомбах их дом,*
*Обрушится Господу в ноги.*

Закончив читать, поэт предложил аудитории воспользоваться моментом и задать вопросы. Парни сориентировались первыми. Хотя выявилась интересная тенденция: уж очень наших ребят волновали проблемы взаимосвязи поэзии и прозы. Все выспрашивали, что лучше, да почему Феликс Эдуардович только стихи пишет, а прозой пренебрегает. Видно, никак не могут юные филологи определиться: то ли им роман написать, то ли стишками побаловаться.

Немного погодя, перешли в наступление и девчата. Тут уж началось настоящее ток-шоу, вроде того, что было на неделе филологического факультета. Прекрасная половина аудитории (а точнее будет сказать процентов 95) предпочла письменную форму общения и буквально завалила Феликса Мыслицкого записками. Не обошли студенты и личную жизнь поэта. Хотя, в общем-то, тот факт, что в его семье главенствует матриархат, никого не удивил. Зато всех девушек явно огорчило то, что Феликс Эдуардович не посвящает стихи своей жене. И даже больше того, он ей их даже не читает. По той простой причине, что она читает их сама.

Была в жизни поэта любовь, которую он увековечил в своих стихах. А звали ее Вероника. Стихи о ней бальзамом пролились на души слушателей. Да и вообще, все стихи о любви слушали с нескрываемым интересом. Весна, знаете ли.

Но для поэта, по его словам, все стихи одинаково любимые и родные, как дети. Это и понятно. Ведь в каждое произведение нужно вложить частичку души, иначе оно просто не будет жить.

Многим понравились стихи Феликса Мыслицкого, некоторые даже приобрели его книги с дарственной надписью. А если кому-то не понравилось, то ответом ему будут слова, сказанные самим поэтом: "Летящий ниже тебя, не поймет твой полет". Так что поднимайтесь выше, господа-товарищи.

**Н. ПОЛЕГИНА,**
**студентка I курса филологического факультета.**

☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺

## *Улыбнитесь!*

◊◊◊

*— До какой степени вы будете испытывать наше терпение? – спросили члены ученого совета соискателя Б.Ахова после очередного провала защиты его диссертации.*

*— До докторской, — невозмутимо ответил соискатель.*

◊◊◊

*Вчера младший научный сотрудник Н.Супников успешно защитил свою кандидатскую диссертацию. Его оппонентом был сын Костя, который хотел отнести диссертацию в пункт приема макулатуры.*

◊◊◊

*— Зачем вы взяли начальника в соавторы своего научного труда? Чтобы он помогал?*

*— Нет, чтобы не мешал.*

◊◊◊

*На комиссии по распределению:*

*— Я не могу поехать на периферию, не посоветовавшись с мужем и детьми!*

*— Но, насколько нам известно, у вас нет ни мужа, ни детей.*

*— Ну что ж, я подожду, когда они у меня будут.*



*Я застаюся сябрам чалавецтва. Дык пашкадуйце вы мяне.*
*Засведчыў фотааб'ектыў* ***У.ЧЫСЦІКА.***

Спорт Спорт Спорт Спорт Спорт

## НАШЫ ПЛЫЎЦЫ — МАЦНЕЙШЫЯ СЯРОД СТУДЭНТАЎ



На блакітных дарожках Мінска перад першамайскім святам па праграме студэнцкай спартакіяды спаборнічалі мацнейшыя плыўцы ВНУ Беларусі. Выдатна выступілі стартсмены нашага універсітэта. Яны заваявалі агульнакамандную перамогу.

На спаборніцтвах найбольшага поспеху дабілася студэнтка 1 курса факультэта фізічнай культуры Віка Гаўрыленка. Яна была мацнейшай на дыстанцыях 100 м і 200 м у плаванні на спіне,а таксама ўнесла важкі ўклад у перамогу ў эстафетах 4×100 м вольным стылем і ў камбінаваным плаванні.

З вышэйшымі ўзнагародамі вярнуліся са спаборніцтваў таксама першакурсніцы названага факультэта Надзея Калькова і Алена Лісаевіч.

Трэба адзначыць, што ў праведзеных спаборніцтвах прымалі ўдзел усе члены мужчынскай зборнай Рэспублікі Беларусь на чале з заслужаным майстам спорту, чэмпіёнам свету Гукавым, які вярнуўся нядаўна з чэмпіянату планеты па плаванню ў г.Ганконгу. Таму вынікі нашых мужчын былі больш сціплымі. І ўсё ж у мужчынскай эстафеце 4×100 м вольным стылем нашым плыўцам удалося апярэдзіць моцныя каманды Акадэміі фізічнай культуры і спорту і Гродзенскага дзярж-універсітэта.

Вялікі поспех нашых плыўцоў — гэта і плён карпатлівай трэнерскай працы старшага выкладчыка кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту Б.М.Гіля.

## МЕДАЛІ УНІВЕРСІТЭЦКІХ АСІЛКАЎ

9 мацнейшых каманд Беларусі па грэка-рымскай барацьбе змагаліся за ўзнагароды ў фінальных спаборніцтвах па праграме студэнцкіх гульняў, што адбыліся ў Мінску.

Асілкі нашага універсітэта ў камандным заліку аказаліся на ганаровым трэцім радку турнірнай табліцы.

Тры сярэбраныя медалі на рахунку выхаванцаў факультэта фізічнай культуры: Алега Кана (58 кг, ІІ курс), Аляксандра Варыводы (63 кг, ІІІ курс), Генадзя Грома (76 кг, IV курс).

Поспех выпаў і на долю юнага барца першакурсніка гістарычнага факультэта Сяргея Пасталоўскага. У вагавай катэгорыі да 54 кг ён узняўся на трэцюю прыступку п'едэстала гонару.

Трэніруе каманду універсітэцкіх барцоў адзін са старэйшых выкладчыкаў майстар спорту С.М.Дзегцяроў.

## ЧЭМПІЁНСКІЯ ЎЗНАГАРОДЫ ВЕТЭРАНАЎ

У беларускай сталіцы адбыліся рэспубліканскія спаборніцтвы па цяжкай атлетыцы сярод ветэранаў. Выдатна выступілі на іх дацэнт кафедры філасофіі ГДУ майстар спорту А.А.Фяськоў і намеснік дэкана матэматычнага факультэта па выхаваўчай рабоце майстар спорту У.А.Галавач. У сваіх узроставых групах і вагавых катэгорыях яны заваявалі вышэйшыя ўзнагароды.

*История серьезная и не очень*

# В ГОСТИ К ХОДЖЕ НАСРЕДДИНУ

А вы, небось, думали, что Насреддин — это фольклорный персонаж, герой массы анекдотов? Не только. Начнем с того, что это весьма реальный человек, живший в Турции в XIII в. и прославивший себя мудрыми изречениями и шутками не меньше, чем Сократ. Некоторые мысли ну очень у них схожи. Например: Жена зло. Но зло необходимое.

Житейская философия Насреддина отразила не только сложный опыт семейной жизни, но и мировоззрение небогатого и не слишком удачливого человека, которому просто надоело оплакивать свои горести — и он решил над ними посмеяться. Этакое утешение философией.

Однажды ходжа с женой пошли на озеро стирать белье. Только достали мыло, как прилетел черный ворон, схватил мыло — и наутек. Жена запричитала, а Насреддин сказал: "Ворону мыло нужнее, ведь он грязнее нас".

Ходжу пригласили на званый обед. Он пришел в поношенном платье — и никто не обратил на него внимания. Тогда он сбегал домой, надел сверху богатую шубу и вернулся. Его встретили с почетом, усадили на лучшее место и стали потчевать. Насреддин сунул рукав шубы в блюдо и сказал: "Раз шубе почет, пусть она и кушает".

Ходжа сидел у озера, макал в воду хлеб и ел. Вдали плавали утки. Кто-то проходил мимо и спросил: "Ходжа, что ты ешь?" "Суп из утки", — ответил Насреддин.

Ходжа Насреддин был образованным человеком, читал проповеди в мечети и вел теософские споры.

Ходжу спросили: "Где Аллах?" "Разве есть место, где нет Аллаха?", — ответил мудрец. И на это нечего было возразить.

Однажды у ходжи украли сто монет. Он пошел в мечеть и долго молился, чтобы Аллах вернул ему деньги. При выходе из мечети его встретил человек и вручил Насреддину сто монет. Оказалось, что был этот человек купцом и вез товары морем, да попал в бурю — и пообещал подарить сто монет почтенному ходже в случае спасения.

"Чудны дела твои, Господи! — сказал Насреддин. — Это же надо, устроить бурю, чтобы вернуть мне деньги. Поистине, неисповедимы пути Аллаха".

Однако как иной раз не пошутить и в мечети? Сказал же однажды ходжа во время проповеди: "Мусульмане, возблагодарим Аллаха за то, что верблюды не летают, иначе крыши домов валились бы нам на голову".

При всем при том Насреддин был известен как справедливый судья и мудрый наставник. Его медицинские рекомендации поражают своей точностью: "Вот вкратце основы здоровой жизни: ноги держи в тепле, голову в холоде, следи внимательно за едой и глубоко не задумывайся". А на вопрос, может ли у столетнего старца быть ребенок, ходжа ответил: "Может, если у него есть молодая жена. И молодые соседи".

К ходже Насреддину так привыкли обращаться при жизни, что сделали его народным святым после кончины. На его могиле в г.Акшехир поставлен мавзолей: четыре столба без стен поддерживают крышу, зато на единственной двери навешено два деревянных замка. Это место весьма почитаемо.

Наш корреспондент прослышал, что раз в год можно подойти к двери мавзолея и, трижды постучав, задать только один вопрос — и Насреддин на него ответит. В урочный день мы прибыли в Акшехир спросить о смысле жизни, но оказалось, что право задать вопрос уже откупил у местного настоятеля мечети и смотрителя гробницы некий новый русский. Он заслонил собой проход и, мучительно напрягаясь, заучивал по бумажке вопрос: "Как срубить побольше баксов?"

На закате настал миг истины — наш соотечественник грохнул жирным кулаком в дверь. "Занято!" — послышалось изнутри. "Кто там?" — спросил ошарашенный посетитель. "Я, кто же еще?!" — сказал голос и умолк. Один вопрос — один ответ.

Говорят, эта история повторяется каждый год. Так ходжа Насреддин учит нас думать собственной головой и не задавать глупых вопросов.

А что, за таким наставлением вполне можно было зайти к нему в гости...

**Ходжа К.ЛАПКИН,**
**наш собственный корреспондент в азиатской Турции.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар
Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ [illegible]
Падпісана да друку ў 15.00
07.05.1999 г.